УДК 947.6 (=411.6) «1914/1916»

# АПЕРАЦЫЯ ПАД КРЭВАМ ЯК АДНА З БУЙНЕЙШЫХ ВАЕННЫХ БІТВАЎ НА БЕЛАРУСКІХ ЗЕМЛЯХ ПАДЧАС ПЕРШАЙ СУСВЕТНАЙ ВАЙНЫ

***М.В. ЦУБА***
*Палескі дзяржаўны ўніверсітэт,*
*г. Пінск, Рэспубліка Беларусь*

**Уводзіны.** Першая сусветная вайна была часам грандыезных перамен як у гісторыі ўсяго чалавецтва, так і ў беларусаў. У жніўне 1915 года на беларускіх землях распачаліся ваенныя дзеянні паміж расійскімі і германскімі войскамі. Нягледзячы на тое, што Свянцянскі прарыў, здзейснены кайзераўскімі войскамі, часткова быў ліквідаваны, усе ж значная частка заходніх беларускіх земляў аказалася пад германскай акупацыяй. Менавіта яшчэ тады, падчас завяршаючай стадыі самага буйнага прарыву Першай сусветнай вайны, у эпіцэнтры бязлітасных, упартых баеў апынуліся прыфрантавыя беларускія мястэчкі Крэва і Смаргонь. Пасля Палескай аперацыі ў кастрычніку 1915 года фронт стабілізаваўся на мяжы Дзвінск – Паставы – Смаргонь – Крэва – Баранавічы – Пінск. У выніку, больш чым два з паловай гады на дадзенай мяжы мела месца пазіцыйная вайна, у час якой акрамя Нарачанскай і Баранавіцкай аперацый на беларускіх землях была праведзена яшчэ і Крэўская ваенная аперацыя, якую з 6 па 9 (19–22) ліпеня 1917 года ажыццявіла 10–я расійская армія пад камандаваннем генерал–лейтэнанта М.М. Кісялеўскага і начальніка штаба генерал–маера А.Ф. Дабрышына [1, с.794].




Лінія фронта на пачатку аперацыі

ПолесГУ

**Асноўная частка.** Аперацыя задумвалася і развівалася наступным чынам. У сувязі з наступленнем англійскіх войск пад Іпрам, каб не даць магчымасці Германіі перакінуць частку сваіх войск з усходу на захад, Антанта патрабавала ад Часавога ўрада на чале з А. Керанскім падтрымкі ваеннымі дзеяннямі на ўсходнім фронце. Аднак, калі чэрвенскае наступленне Паўднева–Заходняга фронту на львоўскім накірунку правалілася, было вырашана праз месяц распачаць наступальную аперацыю Заходняга фронту на ўчастку Крэва – Смаргонь.

Дакладны план Крэўскай аперацыі быў распрацаваны загадзя, яшчэ ў студзені 1917 года, але па розных прычынах тэрмін яе правядзення неаднаразова адкладваўся і карэктыраваўся.

За некалькі дзен да аперацыі ў шэрагах 10–й арміі адбыўся інцыдэнт, які атрымаў шырокі рэзананс. Салдаты 2–й Каўказскай грэнадзерскай дывізіі моцна збілі прысланага да іх камісара. Гэта стала вядома кіраўніку Часовага ўрада А.Ф. Керанскаму, па патрабаванню якога былі прыняты строгія меры да вінаватых, а таксама да камандуючага 10–й арміяй М.М. Кісялеўскага.

У выніку, камандуючы 10–й арміяй, якая павінна была вырашыць лес усёй аперацыі, быў папярэджаны, што ён у хуткім часе будзе зняты са сваёй пасады. Бясспрэчна, што, знаходзячыся ў такой сітуацыі, М.М. Кісялеўскі не мог узяць на сябе паўнавартае кіраўніцтва ўсім ходам аперацыі. І ўсё ж расійскае камандаванне Заходняга фронту на чале з вядомым генералам А.І.Дзянікіным, які асабіста ажыццяўляў каардынацыю і ў сувязі з дадзеным інцыдэнтам больш звычайнага ўмешваўся ў ход аперацыі, ускладвала на паспяховае яе правядзенне вялікія спадзяванні.



**А.Ф. Керанскі праводзіць агляд войск на фронце**



**Генерал А.І. Дзянікін з камандуючымі армій Заходняга фронту. 1917 г**

ПолесГУ

Меркавалася, што 10–я расійская армія пасля магутнага артабстрэлу варожых пазіцый здолее прарваць германскую лінію абароны ў раёне Крэва, авалодае населеннымі пунктамі Солы, Жупраны, Граўжышкі і ў ходзе далейшага наступлення выйдзе на подступы да горада Вільня. Згодна з планам, пад Крэва была дастаўлена вялікая колькасць артылерыі. Па некаторых звестках, да месца прарыву было сцягнута 900 гармат самага рознага калібру. Гэтыя гарматы ў асноўным былі зроблены на заводах Англіі і ЗША, мелі дальнабойкасць звыш 20 кіламетраў і дастаўляліся на фронт разам з боепрыпасамі з розных расійскіх портаў.



**Такія гарматы пастаўляліся Антантай расійскай арміі ў 1916 – 1917 гг.**



**Расійскія артылерысты на пазіцыях. 1917 г.**

Больш магутнай артылерыі, чым пад Крэва, расійская армія дагэтуль яшчэ не збірала. Такім чынам, лес гісторыі наканаваў аднаму з самых старажытных на беларускіх землях абарончых збудаванняў – Крэўскаму замку, вытрымаць самую буйную артылерыйскую атаку расійскіх войск за ўсю Першую сусветную вайну.

У сваю чаргу, праціўнік прыкладаў усе намаганні, рабіў усё магчымае, каб як можна лепш падрыхтавацца да абароны і ўмацаваць свае пазіцыі. Нямецкая абарона налічвала тры лініі, была па–майстэрску ўмацаваная і добра прадуманая.




**Нямецкія ўмацаванні па лініі фронта. 1917 г. Малюнак з нямецкай паштоўкі**

Немцы ўзвялі на сваіх абарончых рубяжах магутныя бетонныя доты. Пры чым шматлікія доты і куляметныя гнезды былі ўмела ўбудаваны і замаскіраваны непасрэдна ў саміх сценах Крэўскага



Полесту

замка і бліжайшых да яго іншых пабудовах. Фактычна, усе каменныя пабудовы ў мястэчку Крэва, былі прыведзены ў абарончы стан і значна павялічвалі абароназдольнасць нямецкіх пазіцый.



**Замаскіраваны нямецкі дот у башні Крэўскага замку**

Меліся надзейна збудаваныя бетонныя бліндажы, у якіх тапіліся грубкі і было электрычнае асвятленне, акрамя таго, электрычны ток быў падведзены да некалькіх радоў загародаў з калючага дроту. Электрастанцыя знаходзілася ў глыбока забетаніраваным бункеры, непадалеку ад вескі Войневічы. Усе драўляныя пабудовы, што знаходзіліся побач з лініяй фронту, былі разабраныя для будаўніцтва самага рознага кшталту ўмацаванняў. Каб любым коштам утрымаць свае пазіцыі, немцы нават правялі з Гудагая да Крэва вузкакалейку, па якой на перадавую дастаўлялі харчаванне і боепрыпасы.



**Бункер, збудаваны немцамі ў Крэўскім замку**

Яшчэ пасля Свянцянскага прарыву мястэчка Крэва было падзелена напалову. Па цэнтральнай частцы мястэчка працякала рэчка Крэўлянка, менавіта яна прадстаўляла сабой мяжу паміж расійскімі і германскімі пазіцыямі. Для прарыву плануемай атакі, эпіцэнтрам якой павінна было стаць Крэва, меркавалася задзейнічаць усю 10–ю расійскую армію (3–ці, 38–мы, 1–шы Сібірскі, 2–гі Каўказскі корпусы), а таксама некаторыя суседнія з ёй фарміраванні таго ж Заходняга фронту (каля 17 тысяч салдат і афіцэраў). Акрамя таго, для барацьбы з самалётамі праціўніка былі створаны спецыяльныя супрацьпаветраныя батарэі і перадыслацыраваны пад Крэва тры авіяцыйныя атрады.

З германскага боку у раёне прарыву займала абарону не болей 8 тысяч чалавек, аднак нямецкім афіцэрам больш–менш удавалася падтрымліваць у сваіх вайсковых фарміравннях дысцыпліну і парадак. Наадварот, у расійскіх войсках з кожным днём дысцыпліна слабела, частымі сталі выпадкі дэзерцірства і невыканання загадаў. Няма сумнення ў тым, што расійскія салдаты, якія знаходзіліся ў той час у Крэўскім рэгіёне, не падтрымлівалі ідэю летняга наступлення, якое рыхтавалася па распараджэнні Часовага ўрада.



**Расійскія акопы на перадавой у раене лініі Крэва–Смаргонь. 1917 г.**

Улічваючы вышэй адзначаныя абставіны, з мэтай падняцця маральнага баявога духу салдат, Часовым ўрадам у Петраградзе была створана «Першая жаночая ваенная каманда смерці», так званы «жаночы батальён смерці» пад камандаваннем Марыі Бачкаровай. З 2–х тысяч добраахвотніц былі адсеяны «ненадзейныя» і тыя, хто не вытрымаў суровых умоў салдацкага жыцця. У выніку ў батальёне засталося крыху болей двухсот найлепш падрыхтаванных да ваеннай справы жанчын. Менавіта пад Крэва, дзе распачалася падрыхтоўка сур'ёзнай наступальнай аперацыі, і быў накіраваны гэты жаночы батальен.



**Агляд жаночага батальена. Другая злева М. Бачкарова**

Камандаванне Заходняга фронту планавала правесці Крэўскую аперацыю ў тры этапы: спачатку нанесці магутны ўдар па пазіцыях праціўніка артылерыяй, затым распачаць імклівыя атакуючыя дзеянні, пасля чаго замацавацца на новых адваяванных у немцаў пазіцыях [2, с. 43].

Артылерыйская падрыхтоўка пачалася 6 (19) ліпеня 1917 года ў 5 гадзін раніцы і доўжылася на працягу трох дзён. Германскія пазіцыі абстрэльваліся нават хімічнымі снарадамі. У выніку артабстрэлу на участку запланаванага месца прарыва нямецкія акопы і ўмацаванні былі моцна пашкоджаны і часткова разбураны, у шматлікіх месцах прабіты праходы ў драцяной загародзе. Мноства драўляных збудаванняў, а таксама хат, што былі за нямецкай лініяй фронту, былі знішчаны і зруйнаваны.

Не вытрымалі артылерыйскага агню і мураваныя будынкі. Найбольш пацярпеў ад артабстрэлу Крэўскі замак, у сцянах якога паўсюдна зеўралі прабоіны, а ад самай прыгожай Княжацкай вежы засталіся толькі рэшткі разбуранага першага паверха. Такі ж лёс напаткаў Свята–Троіцкую царкву,

моцна пашкоджанай таксама аказалася царква святога Аляксандра Неўскага. Увогуле, усё навакolle было зрыта шматлікімі варонкамі і завалена калючым дротам.

9 (22) ліпеня, пасля трохдзённай безперапыннай артпадрыхтоўкі, расійская пяхота перайшла ў атаку. Ужо праз 20 хвілін пасля пачатку наступлення першая лінія германскіх акопаў была занята. Найбольш паспяхова развіваў наступленне 38–мы армейскі корпус пад камандаваннем генерал–лейтэнанта І.Р. Доўбар–Мусніцкага, корпус змог авалодаць галоўнымі ачагамі супраціўлення немцаў у мястэчку Крэва – замкам, касцелам і могілкамі. Вызначылася 175–я пяхотная дывізія пад камандаваннем генерал–маера В.С. Смірнова, якая, авалодаўшы крэўскімі ўмацаваннямі, прасунулася наперад больш чым на 3 км ад першай германскай лініі і змагла заняць вёску Тамасоўка [3, с. 45].

Аднак на некаторых участках бой насіў пераменны характар: пазіцыі раз за разам пераходзілі то ў адны, то другія рукі. У шматлікіх выпадках наступленне расійскіх садат захлыналася падчас пераадольвання перашкод з калючага дроту. Часта ў такіх выпадках немцы расстрэльвалі расійскую пяхоту ва ўпор з кулямётаў, схаваных у добра замаскіраваных і надзейна абароненых бетонных гнёздах, а таксама рабілі абстрэл снарадамі з удушаючымі газамі.



**Атручаныя газам падчас Крэўскай аперацыі накіроўваюцца на эвакуацыйны пункт**

Параўнальна, на невялікай адлегласці прарыва шырыней 20–25 кіламетраў мясцовасць была вельмі разнастайнай. Тут меліся, акрамя населеных пунктаў на чале з Крэвам, лясныя масівы, паляны, балоты, маленькія рэчкі. На дадзенай мясцовасці ў баявых дзеяннях удзельнічалі артылерыя, кулямётныя разлікі, кавалерыя, пяхота. Усё гэта давала магчымасць адсочваць эфектыўнасць узаемадзеянняў розных радоў войск з улікам прыроднай характарыстыкі вышэй адзначанага рэгіёна, дзе праводзілася ваенная аперацыя. Як правіла, у баях у падобнай мясцовасці неабходна выкарыстоўваць гібкае манеўраванне ў спалучэнні з хуткімі, смелымі і рашучымі дзеяннямі ў ходзе атакі. Аднак на пачатку паспяховае на большасці ўчасткаў прарыву наступленне расійскай пяхоты паступова пачало запавольвацца. Сказвалася разбалансаванасць падчас атакі, калі адныя наступалі, а другія не заўседы падтрымлівалі, не было каардынацыі паміж рознымі родамі войск, адсутнасць добра прадуманага манеўру на мясцовасці, значныя страты і нежаданне ў сувязі з гэтым большасці салдат рызыкаваць жыццём фактычна звялі да нуля выдатна спланаваную і паспяхова праведзеную артылерыйскую падрыхтоўку напярэдадні аперацыі.




**Схема наступальных дзеянняў 10–й арміі Заходняга фронту падчас ліпеньскай аперацыі 1917 г.**

Менавіта гэтае наступленне стала жахлівым баявым хрышчэннем для байцоў «жаночага батальёна смерці». Батальён займаў пазіцыю паміж Крэвам і Наваспаскам і ўваходзіў у склад 1–га Сібірскага корпуса 10–й арміі, якім камандаваў генерал–лейтэнант Я.А. Іскрыцкі [1, с. 829].

Пра тое, як праявілі сябе падчас бою жанчыны, паведамляе ў сваіх успамінах генерал А.І.Дзянікін: «Жаночы батальен доблесна перайшоў у атаку, не падтрыманы «рускімі волатамі». І калі распачалося сапраўднае пекла ад варожага артылерыйскага агню, бедныя жанчыны, забыўшыся пра тэхніку рассыпнога строю, сціснуліся ў кучку – бездапаможныя, адзінокія на сваім участку поля, узрыхленага нямецкімі бомбамі. Панеслі страты. А «волаты» часткова вярнуліся назад, часткова зусім не пакідалі акопаў» [4, с. 57].

У выніку, дзве жанчыны загінулі, больш за 30 атрымалі раненні і кантузіі. Камандзір батальёна Марыя Бачкарова пасля гэтага бою была шпіталізавана. Маральны дух батальёна быў зломлены і ў далейшым у баявых дзеяннях ён удзелу не прымаў [5, с. 51].

**Заключэнне.** У рэшце рэшт наступленне поспеху не мела, а на чацвёрты дзень пасля свайго пачатку Крэўская аперацыя была канчаткова спынена. Больш таго, расійскія войскі вымушаны былі адысці на свае старыя пазіцыі. Адтэрмінаванае пакаранне М.М. Кісялеўскага, на якога і тут усклалі галоўную віну, было здзейснена, ён быў зняты з камандавання арміяй і накіраваны ў рэзерв.

Такім чынам, выканаць пастаўленыя мэты і задачы ў ходзе Крэўскай аперацыі ў істотнай ступені не ўдалося, а лінія фронту засталася на ранейшым месцы.

Тым не менш, аперацыя аказала істотны ўплыў на германскае ваеннае камандаванне, якое так і не адважылася ў гэты перыяд перакінуць з беларускіх земляў хоць адно якое-небудзь вайсковае фарміраванне на Заходні тэатр ваенных дзеянняў. А гэта, у сваю чаргу, пасадзейнічала англійскаму камандаванню для вырашэння сваіх стратэгічна–наступальных задач пад Іпрам.

ПолесГУ

## ЛІТАРАТУРА

1. Залеский, К.А. Кто был кто в Первой мировой войне / К.А. Залеский. – М.: ООО «Издательство АСТ» : ООО «Издательство Астрель», 2003. – 894 с.

2. Камінскі, А. Крэва ў полымі Першай сусветнай.../ А. Камінскі // Беларускі гістарычны часопіс. 2007. – № 6. – С. 39–43

3. По следам Первой мировой войны в Беларуси. Сморгонский район : фотоальбом фото и текст В. Багданова. – Мінск : П 41 Гольфстрим, 2007. – 64 : фот.

4. Деникин, А.И. Очерки русской смуты Т.Т. 1–5 1921–1926 / Т.2. 1922 / А.И. Деникин. – Будапешт, 227 с.

5. Кушнер, В. Беларусь у гады Першай сусветнай вайны. Смаргоншчына : трагедыя, гераізм, памяць / В. Кушнер // Беларускі гістарычны часопіс. 2007. – № 6. – С. 44–51

## MILITARY OPERATION NEAR KREVO AS ONE OF THE GREATEST BATTLES ON BELARUSIAN LAND DURING WORLD WAR I

***M.V.TSUBA***

***Summary***

In the article one of the greatest military operations on Belarusian land during World War I has been considered. The research provides the analysis of how the operation was planned, it reveals the objectives and tasks, and shows the attitude of the rivals to famous architectural monuments. Special attention has been paid to the battle itself, in which «women's murder battalion» took part.

© Цуба М.В.

*Паступіў у рэдакцыю 30 сакавіка 2012 г.*

Полесгу